"Убаку ляжаць некалькі тканых узорных настольніц. Хай едуць госці, хай едуць нават сваты – пасцялі на стол, стаў пірагі, частуй мёдам…"

"Тут жа дываны, тканыя па лёне воўнай…"

"А паясы ляжалі ў куфры. Плеценыя або тканыя. У ёлачку, у капытца (ромбы), у пчолку, двух – і шматкаляровыя, шырокія і вузкія…"

Такім чынам даследаванне аднаго толькі раздзела "Куфар жыцця" з нарыса "Зямля пад белымі крыламі" У. Караткевіча раскрывае, наколькі ўдала, па-майстэрску змог аўтар паказаць веданне беларускага народа, яго арыгінальны этнаграфічны побыт. Думаецца, што наша даследаванне дазваляе паглыбіць ўяўленні аб этнічных асаблівасцях матэрыяльнай і духоўнай культуры народа, а таксама дае інфармацыю аб некаторых пытаннях этнакультурнай гісторыі.

Беларускі куфар, яго "сакрэты" па сваіх мастацкіх якасцях, разнастайнасці тыпалагічных варыянтаў, высокай ступені этнічнай спецыфікі ўяўляюць сабой каштоўны і яркі здабытак нацыянальнай культуры. Яго вывучэнне мае вялікую практычную значнасць для асэнсавання лепшых традыцый этнаграфічнага побыту беларусаў.

Спіс літаратуры

1. Караткевіч, У. Зямля пад белымі крыламі / У. Караткевіч. – М., 1997.
2. Цітоў, В. Этнаграфічная спадчына / В. Цітоў. – М., 2001.
3. Салівончык, В. Беларускія народныя паясы / В. Салівончык. – Мінск, 1989.
4. Фадзеева, В. Беларускі ручнік / В. Фадзеева. – Мінск, 1994.

## МІХАЛ КЛЕАФАС АГІНСКІ

*УА "Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт"*

*Майсевіч Д.І, 2 к., 4 гр., МПФ*

*Кафедра рускай і беларускай моў*
*Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык Варанец В.І.*

Выдатны і шчыры паланез "Развітанне з Радзімай", урачыста-сентыментальны дзяржаўны польскі гімн "Яшчэ Польска не згінела". У адзінае цэлае іх злучае імя таленавітага аўтара – знакамітага кампазітара і дзяржаўнага дзеяча Міхала Клеафаса Агінскага, а таксама месца стварэння гэтых цудоўных твораў – невялікая вёсачка Залессе ў Смаргонскім раёне Гродзенскай вобласці.

Нарадзіўся Агінскі не на беларускай зямлі, а на польскай – у маёнтку Гузава, у сямі мілях ад Варшавы 7 кастрычніка 1765 года. Але ў сваіх "Мемуарах" Міхал Клеафас сцвярджаў, што прыналежыць да "ліцвінскага роду" – "ліцвінскаму" не ў этнічным сэнсе, а ў гістарычным. Яго продкі жылі ва ўсходніх межах Магілёўшчыны, былі праваслаўнага

Репозиторий ГрГМУ

веравызнання і мелі тыповае беларускае прозвішча Глушонкі. Агінскімі яны сталі пасля таго, як кароль Рэчы Паспалітай падарыў ім маёнтак Агінты, сапраўды змешчаны на этнічна літоўскай тэрыторыі.

Да пачатку XIX стагоддзя залеская сядзіба была самым звычайным шляхецкім маёнткам, якіх у тыя часы ў Беларусі было мноства. Тым часам яго гаспадаром быў былы кухмайстар літоўскі Францішак Ксаверый Агінскі. Не маючы ўласных дзяцей, сваім спадчыннікам ён абраў пляменніка Міхала Клеафаса .Неабходна адзначыць, што на той час апошні ўжо быў вядомай асобай. У Рэчы Паспалітай ён здолеў даслужыцца да пасады падскарбія літоўскага (намеснік міністра фінансаў Вялікага Княства Літоўскага), а падчас паўстання Тадэвуша Касцюшкі на свае грошы стварыў батальён конных падлоўчых у 500 чалавек і двойчы спрабаваў з ім захапіць Мінск. Пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі ўся яго маёмасць была канфіскавана, а сам ён эміграваў у Заходнюю Еўропу. Аднак пакінутыя на Радзіме ўплывовыя сябры дапамаглі яму хутка вярнуцца дахаты. У 1802 годзе ў Гродне ён прынёс прысягу на вернасць Аляксандру II і атрымаў найвышэйшы дазвол пасяліцца ў Беларусі. У сувязі з гэтым Францішак Агінскі падарыў любимаму пляменніку Залессе, а сам пераехаў ва ўласны палац у Маладзечна, які яму таксама прыналежыў ў тую пару.

Па вяртанні Міхала Клеафаса сядзіба Залессе ператвараецца ў сапраўдны культурны цэнтр, жыццё якога напоўнена музычнымі і літаратурнымі падзеямі. На музычна-літаратурныя вечары сюды з'язджалася навакольная эліта. На першай скрыпцы іграў у канцэртах сам гаспадар, на другой – іспанец Эскундера, віяланчэль браў у рукі ранейшы, слонімскі настаўнік Міхала Клеафаса, а ў той час дырэктар музыкі пецярбургскіх імператарскіх тэатраў – Іосіф Казлоўскі. Кожны з госцяў знаходзіў сабе занятак па гусце.

Частымі гасцямі маёнтка становяцца вядомыя палітыкі і дзяржаўныя дзеячы, пісьменнікі і паэты, музыкі і мастакі. З адмысловай ветлівасцю прымаў гаспадар маёнтка сваіх сяброў і аднадумцаў. Вядома, што менавіта ад сяброў сядзіба і атрымала ўзнёслую назву – "Паўночныя Афіны". Са з'яўленнем Міхала Агінскага ў Залессі пачаўся росквіт сядзібы.

Пасля Парыжа і Вены Залессе М.Агінскаму натуральна здалося даволі глухім і закінутым месцам. Старыя драўляныя будынкі ўжо патрабавалі капітальнага рамонту, ды і не зусім падыходзілі новаму гаспадару. М.Агінскі запрашае да сябе архітэктара, прафесара М.Шульца, які будуе ўнікальны па архітэктуры сядзібны ансамбль у стылі класіцызму. У яго ўвайшлі каменны палац, капліца, млын, гаспадарчыя пабудовы, а таксама пейзажны парк.

Арыгінальным упрыгожваннем комплексу стала наяўнасць тут шэрагу мемарыяльных валуноў. Адзін з іх мае надпіс "Ценям Касцюшкі", другі ж прысвечаны памяці першага гувернёра М. Агінскага.

У Залессі М. Агінскі правёў 20 гадоў. Менавіта тут на свет з'явіліся яго сын і тры дачкі, якім ён надаваў адмысловую ўвагу. Але гэта не



Рэпазіторый ГрДМУ

значыць, што ён вёў жыццё пустэльніка ці вечна нуднага правінцыйнага дробнамаянткавага шляхціча. Зусім не. Яго грамадскае жыццё было напоўнена важнымі падзеямі і сустрэчамі. Яшчэ ў маладосці, быўшы паслом Рэчы Паспалітай у Галандыі і Англіі, ён наладзіў сяброўскія кантакты з уплывовымі палітыкамі розных краін. Зараз жа гэтым захацеў скарыстацца расійскі імператар. М.Агінскі становіцца пасроднікам у перамовах паміж Пецярбургам і Парыжам, і ў 1807 году ў Італіі яго прымае Напалеон І. Аўдыенцыі ж у Аляксандра І становяцца досыць рэгулярнымі. Імператар у 1810 году нават даравaў яму званне сенатара, тытул таемнага дарадцы і ўзнагародзіў ордэнамі Св. Уладзіміра і Аляксандра Неўскага. Агінскі падрыхтаваў праект частковага адраджэння незалежнасці Беларусі ў выглядзе стварэння аўтаномнага Вялікага герцагства Літоўскага, і толькі пачатак вайны 1812 года перашкодзіў ажыццяўленню гэтай ідэі.

Залескі перыяд творчасці самога М.Агінскага надзвычай багаты і разнастайны. Безумоўна, вялікую частку свайго часу ён аддаваў музыцы. Акрамя знакамітага паланеза "Развітанне з Радзімай", прэм'ера якога якраз тут і адбылася, тым часам былі створаны разнастайныя фартэпіянныя п'есы, мазуркі, маршы, менуэты, рамансы і вальсы, выдадзеныя ў двух тамах у Вільні ў 1816 годзе. Менавіта ў Залессі М.Агінскі напісаў свой самы буйны музычны твор – оперу “Зеліда і Валькур ці Банапарт у Каіры". Акрамя гэтага, у маёнтку быў падрыхтаваны гістарычны трактат "Лісты пра музыку" і пачаты мемуары, якія ахопліваюць перыяд з 1788 па 1815 гады.

Але ў 1822 годзе М.Агінскі назаўжды пакідае Залессе і пераязджае ў Італію. Гэты радыкальны крок быў выкліканы яго расчараваннем у магчымасці стварэння аўтаномнага Вялікага герцагства Літоўскага і пачаткам русіфікавання Беларусі. Вынікам гэтага стаў паступовы заняпад маёнтка, які хутка страціў сваё культурна-асветніцкае значэнне – дзеці і ўнукі пераехалі ў заходнюю Літву, куды і перамясцілася галоўная рэзідэнцыя старажытнага роду. Сам жа Агінскі 15 кастрычніка 1833 года памірае ў Фларэнцыі.
Пахаваны ў пантэоне Санта- Крочэ, дзе і знакамітыя італьянцы – Галілео Галілей, Мікеланджэла Буанароці, Джаакіна Расіні і іншыя.

Значныя страты сядзібе прынесла Першая сусветная вайна. Недалёка адгэтуль праходзіла лінія фронта, і Залессе, акупаванае немцамі, не раз падвяргалася артылерыйскім абстрэлам. Менавіта яны цалкам знішчылі барлінны комплекс XVIII стагоддзя і сур'ёзна пашкодзілі парк. У гады ж Вялікай Айчыннай вайны ў палацы знаходзіўся нямецкі штаб, а ў памяшканні былой аранжарэі дзейнічала пачатковая школа. У паваенны перыяд тэрыторыя былой Залескай сядзібы была перададзена ў вядзенне вытворчага аб'яднання “Смаргоньсілікатабетон”, а ў памяшканнях палаца мясцілася хата для састарэлых. Але з 1980-х гадоў пачынаюць распрацоўвацца праекты адраджэння "Паўночных Афін" у ранейшым выглядзе. Паводле апошніх планаў, тут павінна змесцавацца



Репозиторий ГрГМУ

спецыялізаваная навучальная ўстанова з мастацка-музычным ухілам. Пры гэтым частка памяшканняў будзе аддадзена пад музей М.Агінскага. У прасторных гасціных палаца зноў будуць праводзіцца музычна-літаратурныя вечары і навуковыя канферэнцыі.

Усё гэта сведчыць, што за апошнія гады адбылося сапраўднае вяртанне Міхала Клеафаса Агінскага на радзіму. Яго імя, яго творы становяцца ўсё больш папулярнымі ў Беларусі, Літве, Польшчы, Расіі.

## ВЫКАРЫСТАННЕ МАТЭРЫЯЛАЎ НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІКІ Ў НАВУЧАЛЬНА – ВЫХАВАЎЧЫМ ПРАЦЭСЕ *(З ВОПЫТУ НАСТАЎНІКАЎ)*

*УА "Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы"*

*Масальская А.І., 5 к., 4 гр., педагагічны факультэт*

*Кафедра педагогікі*
*Навуковы кіраўнік – доцент Зянькова М.А.*

Вядома, што беларуская нацыянальная культура прайшла вельмі складаны шлях. Прыкладна ў 90-х гадах 20 стагоддзя яна была амаль выцеснена з навучальна-выхаваўчаха працэсу, але гэтай праблеме не маглі дазволіць праіснаваць доўга навуковыя даследчыкі, перадавыя настаўнікі, якія бесперапынна займаліся распрацоўкай і зборам матэрыялаў.

Уладзімір Мікалаевіч Краж у сваім выданні "Беларускія народныя гульні" адлюстраваў сюжэтна-ролевыя, а таксама гульні-карагоды, дзе арганічна спалучаюцца словы, рухі, песні, народныя мелодыі. Усё гэта садзейнічае выхаванню ў дзяцей цікавасці да беларускай творчасці, да роднай мовы [1].

Беларускія народныя гульні – рухавыя, што дапамагае развіць фізічныя навыкі. Гульня – асноўная форма дзейнасці дзяцей, у якой спалучаюцца два важныя фактары: першы, дзеці атрымліваюць маральнае і эстэтычнае задавальненне, знаёмяцца з народнымі традыцыямі і культурай, лепш пазнаюць навакольнае асяроддзе, а ўсё гэта спрыяе выхаванню развітой асобы школьніка.

Алесь Лозка ў выданні "Восеньскі народны каляндар" распрацаваў мерапрыемствы для пазакласнай работы з дзецьмі. Кожнае мерапрыемства праводзіцца з мэтай выхавання павагі да сваіх продкаў, ашчадныя адносіны да матулі-зямлі, бацькаўшчыны. У гэтым выданні ёсць такія сцэнарыі, як *"Прыйшоў багач", "На нашай ніўцы сёння дажынкі", "Падарожжа ў краіну ветлівасці"*[2].

В.А. Шаляговіч, настаўніца школы № 24 г. Брэста, у сваёй працы вялікае значэнне надае беларускім гульням. Яна прапаноўвае наступныя



Репозиторий ГрГМУ